ЛИТЕРАТУРА

1 Хоружий, С. С. Серебряный век России как культурфилософский феномен // Культурология: Дайджест / С. С. Хоружий. – М.: ИНИОН, 2000. – № 3 (15). – С. 58 – 65.

2 Пустыгина, Н. С. К изучению эволюции символизма / Н. С. Пустыгина // Тезисы I Всесоюзной конф. (III) «Творчество Блока и русская культура XX века». – Тарту: ТГУ, 1975. – С. 143-147.

3 Минц, З. Г. Об эволюции русского символизма: (К постановке вопроса: тезисы) / З. Г. Минц // А. Блок и основные тенденции развития литературы начала XX века: Блоковский сборник VII / Отв. ред. З. Г. Минц. Ред. Л.Н. Киселева. – Тарту: ТГУ, 1986. – (Учен. зап. ТГУ, вып. 735). – С. 7 – 24.

4 Ханзен-Лёве, А. Русский символизм. Система поэтических мотивов. Ранний символизм / А. Ханзен-Леве; пер. с нем. С. Бромерло, А. Ц. Масевича и А. Е. Барзаха. – СПб: Гуманитар. агентство «Акад. проект», 1999. – 512 с.

5 Пильд, Л. По поводу статьи Г. Рыльковой / Л. Пильд // Новое литературное обозрение. – 2000. – № 46. – С. 247–249.

6 Белый, А. Проблема культуры / А. Белый // Символизм как миропонимание / А. Белый. – М.: Республика, 1994. – С. 18 – 25.

7 Асоян, Ю, Малафеев, А. Открытие идеи культуры. Опыт русской культурологии середины XIX – начала XX веков / Ю. Асоян, А. Малофеев. – М.: ОГИ, 2000. – 344 с.

8 Бердяев, Н. А. Философия свободы. Смысл творчества / Н. А. Бердяев. – М.: Изд. Правда, 1989. – 605 с.

9 Кацис, Л. Апокалиптика «серебряного века» (Эсхатология в художественном сознании) / Л. Кацис // Русская эсхатология и русская литература / Л. Кацис. – М.: ОГИ, 2000. – С.12 – 33.

10 Исупов, К. Г. Катастрофический историзм Серебряного века / К. Г. Исупов // Социальный кризис и социальная катастрофа. Сб. материалов конф. – СПб.: Санкт-Петербургское философское общество, 2002. – С.226 – 229.

11. Иванов, В. И. Кручи. О кризисе гуманизма / В.И. Иванов // Родное и вселенское / В. И. Иванов; сост., вступ. ст. и прим. В. М. Толмачева. – М.: Республика, 1994. – С. 102 – 112.

12 Гаген-Торн, Н. И. Воспоминания об Александре Блоке / Н. И. Гаген-Торн // Блоковский сборник II: Труды Второй науч. конф., посвящ. изучению жизни и творчества А. А. Блока / Отв. ред. З. Г. Минц. – Тарту: ТГУ, 1972. – С. 444 – 446.

13 Штейнберг, А. Друзья моих ранних лет (1911 – 1928) / А. Штейнберг; подгот. текста, послесл. и прим. Ж. Нива.– Париж: Синтаксис, 1991. – 287 с.

***В. С. Новак***

# ПТУШКІ Ў МІФАЛАГІЧНАЙ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСАЎ

Да ліку сакральных птушак у беларускай міфалогіі адносіцца **бусел**. Семантыка вобраза гэтай птушкі вынікае з народных вераванняў, звязаных з яе прылётам і месцам жыхарства, будаўніцтвам гнязда, іншымі дзеяннямі. У тым, што бусел для беларусаў – святая птушка, можна пераканацца, калі звярнуцца да сцвярджэння Сафіі Васільеўны Калядзенка, 1935 г.н., з в. Пірэвічы Жлобінскага р-на: «Бусел – святая істота. Хто ўб’е яго – саграшыць». Агульнапрынятым у беларускай міфалагічнай традыцыі з’яўляецца меркаванне аб тым, што з гняздом бусла звязана шчасце чалавека: «Усягда гаварылі, гдзе гняздо бусла, там шчасце будзе». Па дзеяннях бусла імкнуліся прадказаць, якім будзе год: «Еслі бусел выкіне з гнязда яйцо – будзе ўраджайны год, а калі пцянца – галодны» (запісана ў в. Пірэвічы Жлобінскага р-на ад Калядзенка Сафіі Васільеўны, 1935 г.н.).

Паводле ўяўленняў В.П. Балянковай, 1927 г.н., з в. Скепня Жлобінскага р-на, «бусел – птушка ад Бога. Бог прыслаў яе к людзям, бо яна прыносіць шчасце, любоў і дабро». Перакананы ў тым, што бусел – «божая пціца», і жыхары в. Сякерычы Петрыкаўскага р-на. Боскасць гэтай птушкі звязваюць найперш з тым, што бусел «памагае ім, аберагае, як той Бог, тожа аберагае людзей» (запісана ад Багачовай Веры Паўлаўны, 1922 г.н.).

Забарону шкодзіць гэтай птушцы звязвалі ў народзе з тым, што буслы «могуць скінуць галавешку на хату ці пуню – і згарыць усё гарам» (запісана ў в. Краснаўка Светлагорскага р-на ад Паўлаўцовай Людмілы Уладзіміраўны, 1950 г.н.).

Убачыць бусла ў палёце – гэта значыць, сімвалічна быць здаровым: «Калі першы раз вясною ўбачыш бусла, які ляціць, то будзеш увесь год здаровы, а калі стаіць – хворы» (запісана ў в. Брынёў Петрыкаўскага р-на ад Субат Фаіны Цімафееўны, 1935 г.н.); «по буську можна прыкмячаць, будзеш у гэтом году болець ці не. Ек угледзіш раз, што вон ляціць – добрэ, ня будзеш балець. Стоіць або ходзіць по зямле – плохо, будзеш болець, особенно ногі» (запісана ў в. Вулька-2 Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл. ад Якубовіч Аляксандры Іванаўны, 1936 г.н.).

Як адзначыла Л.М. Маскалёва, 1939 г.н., з г. Бабруйск Магілёўскай вобл., бусел – «сімвал шчасця. Яго нельга крыўдзіць». Шчасце, паводле народных вераванняў, нават звязвалі з магчымасцю ўбачыць бусла: «Убачыш бусла – шчасце табе будзе вялікае, год будзе добры, ураджайны».

З дзеяннямі бусла звязвалі і прадказанні надвор'я: «Яшчэ ў буська путалі пагоду, казалі: «Бусько, бусько, кінь колоду на дождж ці на погоду. І глядзелі. Еслі вон ляціць і махае крыламі, будзе дождж, а еслі не махае, будзе погода» (запісана ў в. Вулька-2 Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл. ад Якубовіч Аляксандры Іванаўны, 1936 г.н.). «Разуменне бусла як апекуна і распарадчыка ўраджаем і дабрабытам, як істоты, што «прыносіць» дзяцей, сцвярджае натуральнасць яго знаходжання сярод гурту калядоўшчыкаў» [1, с. 52-53]. Невыпадкова важнай зааморфнай маскай у абрадзе калядавання ў некаторых мясцовасцях Гомельшчыны была маска бусла.

**Варона**, «паводле народнай класіфікацыі, належыць да «нячыстых», нешанаваных і несцеражоных птушак» [1, с. 69]. Паводле народных уяўленняў, варона – «небажэственная пціца» (запісана ў в. Гарывада Рэчыцкага р-на ад Грабцэвіч Раісы Ульянаўны, 1937 г.н.). Карканне вароны прагназавала хваробу, дождж, смерць: «Варона каркае і лётае каля дома – на смерць» (запісана ў в. Шырокае Буда-Кашалёўскага р-на ад Цітовай Надзеі Васільеўны, 1939 г.н.); «варона каркае на дождж» (запісана ў в. Шырокае Буда-Кашалёўскага р-на ад Душкевіч Любові Іванаўны, 1936 г.н.); «варона каркае на дождж і на хваробу» (запісана ў в. Шырокае Буда-Кашалёўскага р-на ад Балобан Евы Рыгораўны, 1929 г.н.).

Варону лічылі «цёмнай пціцай, пціцай няшчасця, смерці» (запісана ў в. Сякерычы Петрыкаўскага р-на ад Мышкавец Ганны Кузьмінічны, 1926 г.н.). У некаторых мясцовасцях, паводле сведчанняў інфарматараў, варона сваім карканнем «предвешчае бяду, мо, які пажар, кражу, ну, штосьці нядобрае» (запісана ў в. Гарывада Рэчыцкага р-на ад Грабцэвіч Раісы Ульянаўны, 1937 г.н.). Асцерагаліся, калі варона прылятала на падвор'е. Лічылася, што ў такім выпадку трэба чакаць дрэнных навін.

«**Зязюля**, птушка з роду cuculus, незвычайнасць біялогіі якой (не робіць гнязда, не высіджвае яйкі, не корміць птушанят, трымаецца самотна, скрытна, гучна кукуе, у палёце нагадвае ястраба ды інш.) спарадзіла шмат паданняў, якія міфалагічным спосабам тлумачылі ўсе гэтыя асаблівасці яе незвычайным паходжаннем» [1, с. 199]. Прыведзены тэзіс пацвярджаецца звесткамі, запісанымі ў в. Церуха Гомельскага р-на ад Марыі Герасімаўны Міpановіч, 1935 г.н.: «Зязюля – страшная пташка: гнязда не ўе, яйца не высіжвае, птушанят кідае і дажа з сваімі зязюлятамі не злучаецца».

Ад характару кукавання зязюлі залежаць многія з'явы, напрыклад, моцны мароз звязвалі з тым, што «кукушка кукуе на сухім дрэві» (запісана ў в. Брынёў Петрыкаўскага р-на ад Субат Фаіны Цімафееўны, 1935 г.н.). Пры ўмове, калі ў чалавека, які пачуў першы раз кукаванне зязюлі, ёсць у кішэні грошы, значыць, яны будуць у яго ўвесь год: «Мне ў дзетстве дзед казаў, што еслі пачуеш кукаванне зязюлі ўпершыню і з грашамі будзеш, то будзеш імець іх цэлы год. Ну, і наабарот» (запісана ў в. Церуха Гомельскага р-на ад Міpановіч Марыі Герасімаўны, 1935 г.н.). Асцерагаліся, калі «зязюля закукуе ў вочы чалавеку, то лічылася, што ён будзе цэлы год плакаць» (запісана ў в. Ведрыч Рэчыцкага р-на ад Захарава Мікалая Пятровіча, 1928 г.н.).

Пра генезіс зязюлі распавядаюць шматлікія міфалагічныя аповеды. Паводле аднаго з іх, гэта пераўтвораная ў зязюлю жанчына, якая была пакарана за тое, што ўтапіла сваё дзіця: «Жыла даўно адна жанчына. Была яна цяжарная. Вот калі радзіла яна, то дзіця ўтапіла. Вярнулася дамоў і ўбачыла дзіця ў зеркалі. Спужалася яна, пажалела, што тое здзелала, і пачала плакаць. І па начах так плакала. Тады і пертварыў Бог тую жанчыну ў зязюлю. І зараз аплаквае зязюля сваё дзіця» (запісана ў в. Саўгасная Буда-Кашалёўскага р-на ад Габрусевай Кацярыны Лагвенаўны, 1932 г.н.). Паводле ўспамінаў Н. А. Кісель, 1932 г.н., з в. Сякерычы Петрыкаўскага р-на «кукушка – гэта жэншчына, якую Бог прэўрацiў за тое, што яна кінула сваіх дзяцей. От яна і гукае». З кукаваннем зязюлі звязвалі адказ на пытанне, колькі гадоў жыцця адводзілася чалавеку: «Усе знаюць, што зязюля прадказвае, каму скока жыць, трэба счытаць яе кукаванне» (запісана ў в. Церуха Гомельскага р-на ад Міранoвіч Марыі Герасімаўны, 1935 г.н.).

Верабей – «птушка, якая ў народнай традыцыі надзяляецца пераважна адмоўнымі ўласцівасцямі» [1, с. 430]. Паводле народных міфалагічных уяўленняў, «верабей скача дзвюма ножкамі адразу, бо за правіннасць у часе выбараў птушынага цара яму звязалі ногі. Верабей добра жыве і множыцца, бо гэта дазволіў яму Бог за тое, што ён украў адзін цвік, якім збіраліся прыбіваць Ісуса да крыжа» [1, с. 77].

Інфарматары з розных мясцін Гомельшчыны пацвердзілі, што «верабей – ента праклятая пціца. Трэба гнаць яго ад свайго дома. А праклятая яна таму, што вераб'і насілі гвоздзі ў урэмя распяцця Хрыста» (запісана ў г. Гомель ад Антошкінай Тамары Уладзіміраўны, 1939 г.н.); «верабей – гэта праклятая птушка, таму што сваім цырканнем ён выдаў Хрыста» (запісана ў в. Бялёў Жыткавіцкага р-на ад Жогаль Арыны Міхаўны, 1910 г.н.). Паводле іншых мясцовых запісаў, з вераб'ём у народзе звязвалі якія-небудзь навіны-прадказанні: «Калі верабей няспынна клюе ў вакно, значыць, што яны нам нешта кажуць» (запісана ў в. Ведрыч Рэчыцкага р-на).

Цвырканне вераб'ёў у народных павер'ях асэнсоўваецца як прагназаванне цёплага надвор'я: «Калі вераб'і чырыкаюць – будзе цяпло» (запісана ў в. Брынёў Петрыкаўскага р-на ад Субат Фаіны Цімафееўны, 1935 г.н.). Зыходзячы з іншых народных вераванняў, «калі верабей пастучыць у вакно, значыць, чакай дурного ізвесція» (запісана ў г. Васілевічы Рэчыцкага р-на ад Доўжык Аляксандры Захараўны, 1930 г.н.).

Моц гэтай птушкі, як адзначылі жыхары в. Будка Рэчыцкага р-на, у калектыве: «Вераб'і як тыя жыды. Усе ў кучы. Усе адзін за аднаго б'юцца» (запісана ад Белавус Таццяны Іванаўны, 1924 г.н.).

На тэрыторыі Брэсцкага Палесся быў вядомы звычай лавіць вераб'я і смажыць. «Сувязь з паўднёва-славянскім звычаем пекчы вераб'я прасочваецца ў звычаях на захадзе ўсходнеславянскай зоны (Валынь, Заходняе Палессе, Гродзенская, Віленская, Віцебская губерні), дзе пад Новы год лавілі вераб'я, пеклі, варылі іх, спальвалі, кідалі жывых у печ, пагражалі прыпекчы вераб'ю дзюбу. Рабілі гэта часцей за ўсё для таго, каб летам вераб'і не елі ў полі жыта, каноплі» [2, с. 431].

З вераб'ём звязаны ў народзе наступныя павер'і: «Вераб'я бачыць, злавіць – зацяжарыш, а калі ўжо нявольна (замужам), дык радзіны скора» (Е. Раманаў); «вераб'я бачыць – калі кабета, дак забярэменее. Тое ж: людзі хітруюць. Вераб'я лавіць і спаймаць – выявіць злодзея» (Ляцкий) [3, с. 432].

Ластаўку лічаць чыстай, святой птушкай, надзеленай жаночай сімволікай [1, с. 281]. «У легендзе аб укрыжаванні Хрыста ластаўка старалася палегчыць яго пакуты, вымала калючыя таркі з вянца і падносіла ваду. Таму звітае гняздо ластаўкі ва ўяўленнях беларусаў забяспечвае шчасце ў доме, і вялікі грэх яго разбураць» [1, с. 281].

Доказам таго, што ластаўка – святая птушка, з'яўляецца павер'е аб тым, што «ластавак нельзя крыўдзіць, бо ета світая пцічка» (запісана ў в. Гавяды Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл. ад Корневай Валянціны Яўгенаўны, 1938 г.н.). Вобраз ластаўкі як боскай птушкі адлюстраваны і ў іншых вераваннях, з некаторымі з якіх звязана прагназаванне надвор'я: «Ластаўка ў хату заляцела – да няшчасця» (запісана ў в. Шырокае Буда-Кашалёўскага р-на, раней пражывала ў в. Пучын Брагінскага р-на ад Балобан Евы Рыгораўны, 1929 г.н.).

Паводле сведчанняў жыхаркі в. Скепня Жлобінскага р-на Воранавай Ніны Іванаўны, 1936 г.н., «нельга ў ластаўкі пцянца браць, разараць гняздо, бо будзеш канапатым, як яечкі ў ластаўкі. Яечкі з кропелькамі ў ластаўкі». Як адзначыла гэтая ж інфарматар, з палётам ластаўкі звязвалі змены ў надвор'і: «Ластаўка лятае высока – пагода, нізка – к непагодзе».

Сарока – птушка, звязаная з дэманалогіяй. «У славянскіх і беларускіх этыялагічных міфах пра паходжанне сарокі і яе характэрную чорна-белую афарбоўку гаворыцца, што калі ўсе птушкі чысцілі на загад Бога вадаёмы, сарока схітравала: вымазалася граззю не працуючы ды яшчэ ўзвяла паклёп на каршуна, што той лайдачыў. Калі падман выявіўся, Бог пакараў сароку, гразь назаўсёды прыстала да яе белага пер'я, яна стала чорна-белай» [1, с. 452].

Сярод іншых птушак сарока вылучаецца тым, што з'яўляецца разносчыцай навін: «Сарока прыносіць навасці. Калі пабачу сароку, дык гавару: «Сарока, сарока, харошую навасць мне дай, а дрэнную на хвасце нясі» (запісана ў в. Шырокае Буда-Кашалёўскага р-на ад Душкевіч Любові Іванаўны, 1936 г.н.). Звычайна са стракатаннем сарокі звязваюць добрыя навіны: «Так, калі сарока будзе шчабятаць каля хаты (на заборы, крышы), там скора будуць госці ці свадзьба. А калі ў хаце ё бальны, то ён скора выздаравее» (запісана ў в. Пірэвічы Жлобінскага р-на ад Калядзенка Сафіі Васільеўны, 1935 г.н.).

Паводле некаторых мясцовых павер'яў, паходжанне сарокі звязана з жанчынай, якая «любіла красці ў людзей усё, што блішчыць. За гэта Бог прэўраціў яе ў сароку (запісана ў в. Сякерычы Петрыкаўскага р-на ад Кісель Ніны Адамаўны, 1932 г.н.). Зыходзячы з іншых мясцовых вераванняў, жанчына была ператворана ў сароку, бо разнесла сплетні аб заляцаннях суседа да ўдавы: «Гаварыла мне ета шчэ мая бабка Варка. Так вот у шчэ даўнейшыя ўрэмена ў адном сяле ці, мо, у горадзе (ужэ не помню) жыла жэншчына. Жэншчына як жэншчына, ну, адным словам, такая, як і ўсе жэншчыны. А яны ж, знаеш, як любяць на ўсё паглядзець, усё патрогаць, абгаварыць, судзіць-перасудзіць. Ну, і вот як-та сабраліся етая жэншчына, саседкі, ну, усе, што радам жылі, ля калодца і ўжэ началі абсуждаць усё і гаварыць пра ўсіх. І эта жэншчына ўчула, што суседчый хазяін к удаве пахажвае. А эта ж, знаеш, усяго толькі ўчула, мо, яго, таго, і не было. Ну, вот ана і разнесла ету сплётню на вушы людзям, а яны яе наказалі, і так яна стала сарокай. Толькі як хоча што сказаць – не палучаецца, толькі што кар-кар» (запісана ў в. Пятровічы Светлагорскага р-на ад Пузына Таццяны Пятроўны, 1925 г.н.).

Сімволіка сарокі як ахоўніцы пацверджана звесткамі, запісанымі ў в. Пірэвічы Жлобінскага р-на: «А яшчэ забітую сароку вешалі ў хлеў, каб пазбавіцца ад хлеўніка» (запісана ад Калядзенка Сафіі Васільеўны, 1935 г.н.). Матыў сувязі сарокі з дэманалогіяй гучыць у міфалагічным аповедзе, запісаным у г. Васілевічы Рэчыцкага р-на: «О! Сарока – гэта негадзяйка. Робіць усё дрэннае людзям. Яна ж памочніца нячысціку. Чаго добрага можа прынесці ў двор калечанага і паддзеланага» (запісана ад Доўжык Аляксандры Захараўны, 1930 г.н.).

Паводле народных уяўленняў беларусаў, сава – дэманічная птушка, якая «праз свае драпежныя схільнасці ды начны лад жыцця належыць да дэманічных істот, да птушак іншасвету» [1, с. 444]. Запісы звестак пра гэту птушку дазваляюць меркаваць пра дзве асноўныя крыніцы вераванняў, звязаных з ёю. Да першай групы аповедаў адносяцца тыя, паводле зместу якіх з'яўленне савы каля жылля чалавека асацыіруецца са смерцю: «Калі сава гукае каля хаты, нехта скора памрэ» (запісана ў в. Саўгасная Буда-Кашалёўскага р-на ад Габрусевай Кацярыны Лагвенаўны, 1932 г.н.); «раней казалі, што калі ноччу сава крычыць, то абавязкова нехта памрэ» (запісана ў в. Брынёў Петрыкаўскага р-на ад Субат Фаіны Цімафееўны, 1935 г.н.); «еслі сава села коло хаты на вокно або на дзераві, то гэто к покойніку» (запісана ў в. Вулька-2 Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл. ад Якубовіч Аляксандры Іванаўны, 1936 г.н.).

У другую групу аповедаў з'яднаны тэксты, звязаныя з прагназаваннем будучай цяжарнасці жанчыны: «Сава лётае – дзеўка родзіць» (запісана ў в. Шырокае Буда-Кашалёўскага р-на ад Балобан Евы Рыгораўны, 1929 г.н.); «калі над хатай лятае ды крычыць сава, то кажуць, што там маладзіца зачаравацела» (запісана ў г. Бабруйск Магілёўскай вобл. ад Петуховай Кацярыны Піманаўны, 1932 г.н.).

Асобныя аповеды інфарматараў пацвярджаюць факты сувязі савы з ведзьмай («Сава – чортава птушка, пужае людзей, не спіць па начам, чым-та напамінае ведзьму» (запісана ў в. Сякерычы Петрыкаўскага р-на ад Кісель Ніны Адамаўны, 1932 г.н.)), а таксама з чортам («Сава з чортам звязана. Яна памагае яму. Ён яе, наверна, сатварыў» (запісана ў в. Палессе Светлагорскага р-на ад Захаранка Праскоўі Фядосаўны)).

У пераважнай большасці запісаў праводзіцца думка аб тым, што «сава – птушка чорта» (запісана ў в. Сякерычы Петрыкаўскага р-на ад Кісель Вольгі Іванаўны, 1934 г.н.), «сава – ета чортаў найміч, каторы людзей пужае, штоб не мяшалі нячыстай сіле» (запісана ў в. Целяшы Гомельскага р-на ад Шчадровай Зінаіды Аляксееўны, 1937 г.н.)

«Для савы характэрна шлюбна-эратычная сімволіка. На Беларусі вядомы вясельны звычай – перад прыездам маладых са шлюбу займаць месца за сталом жанчынамі, адна з якіх пераапранута як найбольш камічна «маладой», іншая – «маладым», астатнія без пераапранання сядзяць сваццямі. На Брэстчыне такую «маладую» называюць савой з савянятамі. Сапраўдныя сваты рознымі спосабамі выганяюць «саву» з-за стала, нават падпальваюць на ёй кудзелю (магчыма, адсюль выраз «сава смаленая»), потым адкупляюцца. Савіная грамадка потым дапускае розныя бясчынствы груба-эратычнага характару, нападаючы на дарослых мужчын» [1, с. 445].

Салаўя ў народзе называюць святой птушкай: «Эта святая пціца» (запісана ў г. Гомель). «Салавей не мае асобнага этыялагічнага міфа, яго паходжанне тлумачыцца ў адным сюжэце з зязюляй: салавей – сын той жанчыны, што была замужам за вужам, шчасліва гадавала дзяцей у вужавым падводным царстве, а пасля забойства мужа ператварылася ў зязюлю, стаў салаўём, дачка ў пакаранне – жабай» [1, с. 448].

У адным з міфалагічных аповедаў пацвярджаецца прыведзеная думка аб сувязі салаўя з зязюляй: «Зязюля дружа з салаўём. Салавей пяе, а зязюля яму пакідае яечкі, а сама не садзіцца. Салавей і зязюля на Пасху пяюць» (запісана ў в. Будка Рэчыцкага р-на ад Белавус Таццяны Іванаўны, 1924 г.н.).

Калі месцам жыхарства салавей абіраў сад якога-небудзь гаспадара, то, лічылася, што гэта да дабра: «Калі пасяляўся салавейка ў цябе ў садзе, то к дабру. Ён шчасця зазывальнік» (запісана ў в. Сякерычы Петрыкаўскага р-на ад Мышкавец Ганны Кузьмінічны, 1926 г.н.). Калі ж салавей пакідае падвор’е, то гэта сімвалізавала страту дастатку: «Еслі завёлся ва дварэ – к харошаму, к прыбылі, а еслі ўляцел – к убытку» (запісана ў г. Гомель ад Бандарэнка Зоі Іванаўны, 1934 г.н.). З вышынёй палёту гэтай птушкі звязвалі стан надвор’я: «Калі ляціць салавей уверх – к пагодзе» (запісана ў в. Скепня Жлобінскага р-на ад Воранавай Анастасіі Рыгораўны, 1928 г.н.).

Ёсць сведчанні, што салавей выконваў функцыю медыятара паміж гэтым і тым светам: «Салавей пераносе навіны ад душ да родзічаў памерлых. Песняй сваёй ён суцяшае душы. А родзічам дае надзею на то, што душэ ў новым доме добра. Таму ўсе і любяць салаўя, любяць слухаць яго песні. Хоць яны часцей сумныя, но ўспакаенне душы прыносяць» (запісана ў г. Добруш ад Тамашовай Марыі Данілаўны, 1927 г.н.).

Прыведзеныя прыклады хоць і нешматлікія, аднак яны пацвярджаюць, на колькі багаты спектр міфалагічных уяўленняў, звязаных з птушкамі.

ЛІТАРАТУРА

1 Славянские древности: Этнолингвистический словарь : в 5-ти томах / под ред. Н. И. Толстого. – Т. 1: А-Г. – М.: Международные отношения, 1995. – 584 с.

2 Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.]; склад. У. Клімовіч. – 2-ое выд., дап. – Мн.: Беларусь, 2006. – 599 с.

3 Зямная дарога ў вырай: Беларускія народныя прыкметы і павер’і. Кн. 3 / уклад., прадм., пер. і паказ. У. Васілевіча. – Мн.: Маст. літ., 1999. – 654 с.